Юры Аляксандрэнкаў

# Сем гадоў Адраджэння... Фрагменты гісторыі

*Abstracts.*

У рэцэнзіі аналізуецца кніга вядомага беларускага палітыка першай паловы 1990-х гадоў Сяргея Навумчыка, паказана аўтарская інтэрпрэтацыя палітычных падзеяў 1988—1995 гадоў, у прыватнасці дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР (пазней Рэспублікі Беларусь) XII скліканння і эвалюцыі Беларускага народнага фронту як галоўнай апазіцыйнай сілы Беларусі. Таксама разглядаецца стаўленне Сяргея Навумчыка да дзеячаў культуры і палітыкі ды вызначэнне іх ролі ў палітычных працэсах 1988—1995 гадоў.

*Ключавыя словы:* БНФ, палітычная гісторыя Беларусі, Вярхоўны Савет XII склікання, парламент Рэспублікі Беларусь, палітычная апазіцыя.

**Навумчык С. Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995).** —Варшава—Прага, 2006.

Кніга Сяргея Навумчыка «Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995)» належыць да шэрагу выданняў, дзе былыя і дзейныя палітыкі выкладаюць сваю версію найноўшай гісторыі Беларусі і асэнсоўваюць свай досвед ўдзелу ў палітычных баталіях. Тэксты такіх кніг, без сумневу, пішуцца з суб'ектыўнай пазіцыі, але яны цікавыя для палітычнага аналізу, бо дазваляюць «рэканструяваць» матывы асобных палітыкаў і прадстаўляюць эмпірычны матэрыял, істотны для разумення эпохі.

Раней ужо выдаваліся ўспаміны людзей, якія маюць дачыненне да беларускай палтыкі, — Мікалая Дземянцея (Дементей, 2005), Мечыслава Грыба (Гриб, 2005), Аляксандра Фядуты (Федута, 2005), Васіля Лявонава (Леонов, 2003). Фактычна можна гаварыць пра фармаванне цэльнага корпуса аўтабіяграфічных тэкстаў, што ахопліваюць практычна ўсе спектры беларускага палітычнага поля і прэзентуюць разнастайныя, у тым ліку і супрацьлеглыя, пазіцыі. Чытачам гэтых кніг будзе цікава супаставіць інтэрпрэтацыі знакавых падзей беларускай гісторыі, розныя пункты гледжання на іх прычыну, развіццё і значэнне для Беларусі.

У кнізе «Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995)» С. Навумчык прэзентуе падзеі 1988—1995 гадоў у Беларусі з пазіцый асяродкаў, блізкіх да Зянона Пазняка, які ўзначальваў Беларускі народны фронт з часу яго стварэння да 1999 года. Дадзеная пазіцыя дастаткова добра выяўляецца ў ацэнцы паказаных падзей. Напісаная З. Пазняком прадмова адлюстроўвае асноўную канцэптуальную рамку выкладу матэрыялу: імперыя (Расея) — каланізацыя — дэнацыяналізацыя.

«Праца Сяргея Навумчыка цікавая ня толькі выразнымі апісаньнямі падзеяў, трапнымі характарыстыкамі асабаў, дакладнымі высновамі, але таксама адэкватным беларускім бачаньнем працэсаў, адраджэнскай канцэптуальнасьцю ацэнак, якія вынікаюць з галоўнай сутнасьці адвечнага змаганьня з Усходам — быць ці ня быць Беларусі. (...)

Сяргей Навумчык канстатуе, што палітычны працэс Беларускага нацыянальнага Адраджэньня прыпынены з прычыны захопу ўлады ў Беларусі прамаскоўскімі сіламі. Аналізуючы становішча і пэрспэктывы разьвіцьця Беларусі, аўтар (як і ўсе мы цяпер) ня можа не трывожыцца за

лёс Бацькаўшчыны, якая апынулася нібы закладніцай уласнага лёсу».

Чырвонай ніткай у кнізе праходзіць ідэя пра тое, што імперская палітыка Масквы заўсёды была і застаецца скіраванай на ўтрыманне Беларусі ў сферы свайго ўплыву. Гэтым тлумачацца складанасці ў пабудове незалежнай беларускай дзяржавы. Імкненне ўладаў замоўчваць рэальныя маштабы і прычыны Чарнобыльскай трагедыі і падзей у Курапатах разглядаецца як спроба зняць цяжар адказнасці з Масквы за тое, што адбылося. Самымі значнымі дасягненнямі БНФ, на думку С. Навумчыка, з'яўляюцца раскрыццё праўды пра Чарнобыль і Курапаты, культурна-асветныя праекты, а таксама абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Да таго ж аўтар адстойвае тэзіс, што калі б не актыўная пазіцыя і дзейнасць БНФ, то абвяшчэнне незалежнасці Беларусі магло б і не адбыцца.

Выкарыстанне С. Навумчыкам у назве кнігі слова «фрагменты» сведчыць пра тое, што ён не прэтэндуе на сістэматычны выклад матэрыялу, што цалкам адпавядае зместу.

Сяргей Навумчык асвятляе з пазіцыі інсайдэра асобныя падзеі ў палітычнай сферы Беларусі, дастаткова падрабязна апісвае дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР (пазней Рэспублікі Беларусь) XII скліканя, а таксама эвалюцыю Беларускага народнага фронту як галоўнай апазіцыйнай сілы ў рэспубліцы / краіне.

Пры выкладзе матэрыялу аўтар выкарыстоўвае метад паглыбленага апісання асобных найбольш важных з яго пункту гледжання падзей, уводзячы іх у агульны кантэкст набыцця Беларуссю незалежнасці. С. Навумчык часта цытуе беларускіх палітыкаў, што значна ажыўляе тэкст.

Персанажы кнігі разнастайныя, як і ацэнкі іх палітычных і маральных якасцяў (дадзеным аспектам адводзіцца нямала ўвагі). Сярод палітычных дзеячаў найбольш часта пазітыўна згадваецца З. Пазняк, які ў той час быў лідэрам БНФ і, фактычна, усіх нацыянальна арыентаваных сілаў Беларусі. Станіслаў Шушкевіч паказаны як нерашучы і непаслядоўны чалавек, які сімпатызуе БНФ і дэмакратычным ідэям, але ў многім адказны за правал дэмакратычнага выбару Беларусі. Вячаслаў Кебіч прадстаўляе прамаскоўскі і пракамуністычна арыентаваную частку наменклатуры, што да апошняга супрацiўлялася стварэнню незалежнай беларускай дзяржавы. У сваю чаргу Аляксандр Лукашенка выглядае чалавекам, які кіруецца інтарэсамі Масквы і дзеянні якога фактычна перарвалі працэс нацыянальнага адраджэння Беларусі.

З дзеячаў культуры аўтар найбольшую ўвагу аддае Васілю Быкаву і Нілу Гілевічу. Першы апісаны як чалавек з вялікім маральным (і палітычным) аўтарытэтам і як паслядоўны прыхільнік БНФ. Ніл Гілевіч, наадварот, выступае як непаслядоўны і нерашучы прыхільнік Беларускага народнага фронту.

Храналагічнымі рамкамі працы з'яўляюцца 1988 — 1995 гады, калі, на думку аўтара, адбывалася нацыянальнае адраджэнне, якое разам з сацыяльна-палітычным кантэкстам, ёсць асноўным прадметам дадзенай кнігі. З інстытуцыйнага пункту гледжання нацыянальнае адраджэнне, згодна з С. Навумчыкам, звязанае амаль выключна са стварэннем і эвалюцыяй Беларускага народнага фронту. Межы перыяду маюць канкрэтныя даты.

«Ї калі ў вызначэньні папярэдніх хваляў гісторыкі апэруюць тэрмінамі "плюс-мінус" год, а то і дзесяцігодзьдзе — дык апошняе Адраджэньне мы нават можам вылічыць па днях. Падаецца, што гэты пэрыяд вызначаны 1988 годам, калі ў чэрвені быў надрукаваны артыкул Пазьняка і Шмыгалёва "Курапаты — дарога сьмерці", а ў кастрычніку ўтвораны Аргкамітэт БНФ, — і да лукашэнкаўскага рэфэрэндуму ў траўні 1995 г. Калі больш канкрэтна — з 3 чэрвеня 1988 году да 14 траўня 1995-га.

Гэта — сем гадоў.

Альбо 2537 дзён».

Далей паспрабуем узнавіць логіку аўтарскага выкладу матэрылу.

У канцы 1980-х гадоў некаторыя прадстаўнікі партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва БССР сімпатызавалі ідэі нацыянальнага Адраджэння. Аднак расстаноўка сілаў у кіраўніцтве рэспублікі склалася такім чынам, што дыялог паміж нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыяй і партыйным кіраўніцтвам стаў немагчымым. Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі праводзіў актыўную і жорсткую прапаганду супраць нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі, што заўважна вылучала Беларусь сярод практычна ўсіх рэспублік Савецкага Саюза.

У 1988 годзе з разрозненых нацыянальных груп быў створаны кансалідаваны палітычны рух — Беларускі народны фронт. Першапачаткова БНФ змагаўся за неабходнасць «рэальнага суверэнітэту Беларусі, абвешчанага Канстытуцыяй БССР і СССР», а таксама за «адраджэньне

праўдзівай, навуковай гісторыі Беларусі», за «ўсебаковае разьвіцьцё культуры беларускага народу» і «свабоднае разьвіццё мовы і культуры ўсіх нацыянальнасьцяў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі», за «поўны рэспубліканскі гаспадарчы разьлік» (Навумчык, 2006: 14). Асаблівая ўвага аддаецца развіццю нацынальнай мовы і культуры.

Першая знакавая падзея палітычнай барацьбы ў Беларусі — выбары ў Вярхоўны Савет СССР увесну 1989 года. Пры гэтым упершыню была парушаная манаполія Камуністычнай партыі на ўладу, і пэўная колькасць кандыдатаў, падтрыманых БНФ, перамаглі на выбарах і сталі дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР, які неўзабаве спыніў сваё існаванне. Савецкая наменклатура ў Вярхоўным Савеце БССР, імкнучыся перахапіць ініцыятыву нацыянальнага будаўніцтва ад руху БНФ, 26 студзеня 1990 года прыняла закон «Аб мовах у Беларускай ССР», згодна з якім беларуская мова была прызнаная дзяржаўнай.

Пасля выбараў у Вярхоўны Савет БССР 1990 года і да 1994 года цэнтрам барацьбы за незалежнасць і адраджэнне Беларусі стала група дэпутатаў БНФ Вярхоўнага Савета XII склікання, дзейнасці якой аўтар аддае даволі шмат увагі. Асноўным праціўнікам незалежнасці, на думку С. Навумчыка, выступае партнаменклатура, адстаўныя і дзейныя вайскоўцы, а таксама прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый. Партнаменклатура ў парламенце ўяўляла з сябе адзіную сілу і галасавала ў адпаведнасці з указаннямі з ЦК КПБ.

Бальшыню дэпутатаў Вярхоўнага Савета XII склікання аўтар характарызуе як людзей, далёкіх ад палітыкі, якія балатаваліся ў Вярхоўны Савет выключна для таго, каб зрабіць кар'еру ў структуры выканаўчай улады, наладзіць асабісты бізнэс ці, у лепшым выпадку, выбіць для роднага калгаса або завода дадатковыя матэрыяльныя рэсурсы. Такія людзі не маглі, ды і не імкнуліся, вызначаць шляхі развіцця Беларусі і весці неабходную для таго палеміку.

Сяргей Навумчык паказвае дзейнасць парламенцкай групы «Беларусь» (Генадзь Казлоў, Валеры Паўлаў, Мікалай Скарынін і інш.), створанай пасля забароны КПБ-КПСС. На меркаванне аўтара, група дзейнічала ў інтарэсах Масквы, добра пралічваючы свае дзеянні і ўмеючы прымусіць парламенцкую бальшыню прагаласаваць за «патрэбныя» законапраекты. Іх дзеянні, як лічыць С. Навумчык, у значнай меры спрыялі падпісанню дамовы пра калектыўную бяспеку і ўвядзенню інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі (разам з А. Лукашэнкам, групай Генадзя Карпенкі і «маладымі ваўкамі»).

У структуры Вярхоўнага Савета аўтар вылучае таксама «дэмакратычны кірунак» (Навумчык, 2006: 21) і называе пайменна дэпутатаў, якія ўвайшлі ў парламенцкую групу БНФ, што першапачаткова была сфармаваная ў колькасці 26 чалавек, і яшчэ 22 дэпутаты, якія склалі «апазіцыю» — аснову «дэмакратычнага дэпутацкага клуба». Апазіцыя не была аднародная, яе склад змяніўся за час працы Вярхоўнага Савета БССР (Рэспублікі Беларусі) XII склікання.

Апазіцыі супрацьстаяў таксама чыноўны апарат, які меў рэальную ўладу і да якога апазіцыянерам даводзілася звяртацца для вырашэння канкрэтных пытанняў.

Аўтар апісвае механізм дзейнасці апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце і пэўныя ўдалыя прыклады рэалізацыі іх стратэгіі і тактыкі. Ён падрабязна спыняецца на палітычным аспекце праблемы Чарнобыля і прыняцці Дэкларацыі аб суверэнітэце (адлюстраваны падзеі 27 ліпеня 1990 года), паказвае падзеі ў Літве ў студзені 1991 года.

Лінія выкладу працягваецца сакавіком 1991 года, калі адбыўся рэферэндум па пытанні захавання СССР. У той час ішла барацьба за падпісанне новай саюзнай дамовы. Тут аўтар адзначае скрайне варожую для нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі пазіцыю М. Дземянцея.

У кнізе паказаны ход падзей 19—21 жніўня 1991 года ў Беларусі, якія прывялі да прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце 25 жніўня 1991 года. Галоўнай заслугай нацыянальна арыентаваных сілаў у дадзены перыяд аўтар лічыць арганізацыю адукацыйных і прапагандысцкіх беларускамоўных цэнтраў і стварэнне сістэмы нацыянальнай адукацыі. БНФ падаў ідэю «энергетычнай незалежнасці» і стварэння балта-чарнаморскага калектара і, у больш шырокім кантэксце, палітычнага блока краінаў Балта-Чарнаморскага рэгіёну (Літвы, Латвіі, Эстоніі, Беларусі і Украіны). 25 сакавіка 1993 года масава быў адзначаны Дзень Волі.

З лета 1992 года палітычны ландшафт пачаў змяняцца. Як «злева», так і «справа» ствараліся палітычныя партыі, якія пазіцыянавалі сябе як альтэрнатыву БНФ (гэта ацэньваецца аўтарам, у цэлым, негатыўна). Захоўвалася манаполія на

СМІ, была падпісаная Дамова аб калектыўнай бяспецы і, нарэшце, 15 снежня 1993 года дэпутат А. Лукашэнка выступіў у Вярхоўным Савеце са знакамітым антыкарупцыйным дакладам. Ужо з другой паловы 1992 года афіцыйныя СМІ занялі адкрыта антынезалежніцкія пазіцыі. Яны актыўна агітавалі за В. Кебіча і жорстка «крытыкавалі» БНФ. Пазіцыю В. Кебіча па ключавых пытаннях падтрымаў А. Лукашэнка, таму А. Лукашэнка і З. Пазняк былі ў няроўных умовах — такая выснова аўтара.

26 студзеня 1994 года С. Шушкевіча вызвалілі з пасады старшыні Вярхоўнага Савета. У Беларусі ўводзіўся інстытут прэзідэнцтва, і 27 сакавіка 1994 года А. Лукашэнка заявіў пра свае прэзідэнцкія амбіцыі. Для прыходу А. Лукашэнкі і каманды «маладых ваўкоў» (сярод якіх асабліва вылучыліся Дзмітры Булахаў, Віктар Ганчар, Віктар Кучынскі, Анатоль Лябедзька, Леанід Сініцын, Іван Ціцянкоў і Віктар Шэйман) да ўлады, на думку аўтара, прыклаў намаганні КДБ.

Аўтар адзначае дзейнасць праціўнікаў палітыкі БНФ, якія ў 1994—1995 гады падтрымлівалі А. Лукашэнку, а пазней перайшлі ў апазіцыю (А. Фядута, А. Лябедзька, Ю. Захаранка, В. Ганчар, М. Грыб).

Асаблівае месца адводзіцца разгляду паваротных падзей, што вызначылі ход гісторыі Беларусі і прывялі да актуальнай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі. Аўтар вылучае 6 такіх «ключавых момантаў»:

1. Адмова ад правядзення ініцыяванага ў 1992 годзе дэпутацкай групай БНФ рэферэндуму па пытанні датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет. Папулярнасць апазіцыі давала магчымасць стварыць новы расклад сілаў у новым парламенце. Дэструктыўную пазіцыю па дадзеным пытанні занялі Вольга Абрамава і Станіслаў Шушкевіч.

2. Увядзенне інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі, што адкрыла шлях да канцэнтрацыі ўлады ў адных руках і стварэння аўтарытарнай палітычнай сістэмы. БНФ паслядоўна выступаў за парламенцкую рэспубліку на прыбалтыйскі ўзор, аднак менталітэту большасці дэпутатаў больш блізкай была аўтарытарная мадэль кіравання.

3. Адмова В. Кебіча зняць сваю кандыдатуру ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў, што магло б прывесці да зрыву выбараў, бо ў другім туры многія галасавалі не за А. Лукашэнку, а супраць В. Кебіча.

4. Блакаванне закону аб выбарах у парламент па змешанай сістэме. Асаблівую ролю ў блакаванні закону адыграў прадстаўнік прэзідента А. Лукашэнкі ў Вярхоўным Савеце А. Лябедзька. Такі закон не дазволіў прайсці ў Вярхоўны Савет XIII склікання кандыдатам ад партыі Беларускага народнага фронту.

5. Правядзенне рэферэндуму ў 1995 годзе па пытаннях дзяржаўнай сімволікі, статусу беларускай мовы, інтэграцыі з Расеяй і правам прэзідэнта распускаць парламент. Задушэнне галадоўкі апазіцыйна настроеных дэпутатаў Вярхоўнага Савета. Як было адзначана ў пачатку кнігі, гэтыя падзеі азнаменавалі завяршэнне нацыянальнага адраджэння.

6. Няздзейснены імпічмент А. Лукашэнкі ў лістападзе 1996 года.

На заканчэнне хацелася б адзначыць, што палітыка — гэта мастацтва магчымага. Выкладзеная аўтарам пазіцыя прадстаўляе сябраў БНФ рыцарамі-ідэалістамі, якія імкнуліся стварыць незалежную дэмакратычную рынкавую рэспубліку, але не ўлічвалі ў сваіх дзеяннях геапалітычны кантэкст, лад мыслення і спосаб паводзінаў людзей, што займалі пазіцыі ва ўладнай структуры Беларусі, а таксама, у значнай ступені, стэрэатыпы мыслення і настрояў насельніцтва Беларусі.

**Літаратура**


1. Гриб М. Белорусский мост: история, факты, события. — Минск, 2005.
2. Дементей Н. Уроки жизни. — Минск: БЕЛТА, 2005.
3. Леонов В. Работа над ошибками. — Смоленск: Скиф, 2003.
4. Федута А. Лукашенко: Политическая биография. — Москва: Референдум, 2005.